УДК 373.5.016:811.161.3

# СУЧАСНЫЯ НЕСТАНДАРТНЫЯ ЎРОКІ

***А.У. Канапелька*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***В.М. Шаршнёва***,
канд. філал. навук, дацэнт

Нестандартны ўрок, паводле Н.П. Баранавай, – гэта «вучэбныя заняткі, якія маюць нетрадыцыйную структуру; інавацыйныя метады і сродкі адукацыі, накіраваныя на павышэнне якасці адукацыі. Галоўная мэта нестандартных урокаў – фарміраванне цікавасці навучэнцаў да вучэбнага прадмета ў прыватнасці і да вучэбнай дзейнасці ўвогуле» [1, с. 45]. Метадыст З.Б. Варановіч [2] разглядае такія формы ўрокаў, як урок-семінар, урок-залік, урок-лекцыя. М.Г. Яленскі асобна вылучае яшчэ ўрок-практыкум і ўрок-даследаванне. Кожны з нестандартных урокаў мае сваю спецыфіку. **Урокі-семінары** садзейнічаюць фарміраванню ўменняў працаваць з кнігай і навыкаў маналагічнай мовы. **Урокі-залікі** дапамагаюць забяспечыць кантроль і ацэнку ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па той ці іншай тэме. **Урокі-лекцыі** па сваім характары павінны насіць праблемны характар і спалучацца з гутаркай, у ходзе якой вучнямі выконваюцца асобныя заданні настаўніка, звязаныя з узнаўленнем ужо вывучанага школьнікамі матэрыялу ці з неабходнасцю яго абагульнення і сістэматызацыі. **Урок-практыкум** мэтазгодна праводзіць з мэтай замацавання ведаў, уменняў і навыкаў па вывучаным матэрыяле. **Урок-даследаванне** выкарыстоўваецца пры тлумачэнні новага матэрыялу і ўяўляе пошук адказаў на ключавыя пытанні тэмы ўрока. М.Г. Яленскі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лічыць, што нетрадыцыйныя формы навучання, як і звыклыя тыпы ўрока, у аснове сваей класіфікацыі найперш маюць мэтавы кампанент [3]. Менавіта таму іх мэтазгодна разглядаць як асобны падтып традыцыйных тыпаў урока. І толькі тыя новыя формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці вытрымліваюць выпрабаванне часам, якія маюць канкрэтную мэтавую ўстаноўку і адпаведныя ёй структуру і змест працы.

## Літаратура


1. Белорусская педагогическая энциклопедия : в 2 т. / редкол.: Н. П. Баранова [и др.]. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2015. – Т. 2 : Н – Я / [науч. ред.: С. П. Самуэль, З. И. Малейко]. – 726 с.
2. **Варановіч, З. Б.** Методыка выкладання беларускай мовы : вучэб. дапаможнік / З. Б. Варановіч. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 248 с.
3. **Яленскі, М. Г.** Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка : вучэб. дапаможнік для студ. вузаў / М. Г. Яленскі. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 224 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова